Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
____________________ А.І.Жук
“____” ______________ 2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД-____/тып.

# АКЦЁРСКАЕ МАЙСТЭРСТВА

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*
*напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)*

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
навучальных устаноў і кадраў
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
________________ Н.Ю.Шмакава
“___” ________________ 2009 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання вышэйшых навучальных
устаноў Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне культуры
і мастацтваў
________________ Б.У.Святлоў
“___” ________________ 2009 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ Ю.І.Міксюк
“___” ________________ 2010 г.

Рэктар дзяржаўнай установы
адукацыі “Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы”

_______________ М.І.Дзямчук
“___” ________________ 2010 г.

Эксперт-нормакантралёр
________________ ________________
“___” ________________ 2010 г.

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*І.А.Алексніна,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў (пратакол № 9 ад 13.06.2008 г.);

*В.С.Іваноўскі,* загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, дацэнт;

*У.А.Мішчанчук,* дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (пратакол № 10 ад 29.05.2008 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 25.11.2008 г.);

*навукова-метадычным* саветам па народнай творчасці (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 18.09.2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: *В.В.Каташвілі*
Адказны за выпуск: *І.А.Алексніна*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Акцёрскае майстэрства” з’яўляецца адной з прафілюючых у працэсе падрыхтоўкі рэжысёраў, арганізатараў тэатральнай творчасці, выкладчыкаў спецыяльных тэатральных дысцыплін спецыяльнасці 1-18 01 01 “Народная творчасць (па напрамках)”, напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-03 “Народная творчасць (тэатральная)”. Яе выкладанне неразрыўна звязана з засваеннем студэнтамі іншых спецдысцыплін, такіх, як “Рэжысура”, “Сцэнічная мова”, “Сцэнічны рух”, “Пластыка”, “Фехтаванне”, “Грым”, “Вакал”.

Аснову для выкладання дадзенай дысцыпліны складаюць лепшыя здабыткі нацыянальнай (Е.А.Міровіч, К.М.Саннікаў, В.П.Рэдліх і інш.) і замежнай акцёрскіх школ, асабліва спадчына К.С.Станіслаўскага, У.І.Неміровіча-Данчанкі, Я.Б.Вахтангава, М.А.Чэхава, У.Э.Меерхольда і інш.

Галоўнай **мэтай** навучання з’яўляецца знаёмства студэнтаў з асновамі выканальніцтва на сцэнічнай пляцоўцы і практычнае авалоданне імі ў эцюдах, урыўках з інсцэніраваных і драматычных твораў, тэматычным канцэрце, аднаактовых і шматактовых спектаклях.

Асноўныя **задачы** дысцыпліны:

– знаёмства з сістэмай Станіслаўскага і практычнае авалоданне элементамі ўнутранага і знешняга сцэнічнага самаадчування акцёра па прынцыпу паэтапнасці і паслядоўнасці: ад вывучэння элементаў унутранай тэхнікі да стварэння мастацкага вобраза ў шматактовым спектаклі;

– знаёмства з прафесійнай акцёрскай этыкай і дысцыплінай (паводле К.С.Станіслаўскага) і выкарыстанне на практыцы;

– авалоданне асновамі стварэння сцэнічнага вобраза ў розных па жанры і стылі работах;

– раскрыццё і развіццё арганічнай прыроды акцёра, яго чалавечай і творчай індывідуальнасці;

– выхаванне пачуцця ансамблевасці, калектыўнай творчасці ў тэатральным мастацтве;

– выхаванне творчай самастойнасці будучага рэжысёра ў рабоце над стварэннем сцэнічнага вобраза ў драматургіі малых і вялікіх формаў, канцэрце.

У адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі выпускнік павінен ***ведаць:***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асновы сістэмы К.С.Станіслаўскага і вучэнне аб тэатры У.І.Неміровіча-Данчанкі;

– прынцыпы псіхафізічнага існавання акцёра на сцэне;

– стылявыя асаблівасці акцёрскай ігры;

– прыёмы творчых падыходаў да ўвасаблення сцэнічнага вобраза;

– методыку працы над роляй у розных жанрава-стылявых драматычных творах;

– этапы засваення прапаноўваемых абставінаў п’есы і ролі;

– прынцыпы кампазіцыйнай будовы сцэнічнага вобраза;

– прыёмы псіхафізічнага галасавога трэнінгу;

– асновы сцэнічнага руху;

– асновы грыміравання;

– асновы вакальнага выканальніцтва.

Павінен ***умець:***

– выкарыстоўваць метад фізічных дзеянняў і дзейсны аналіз ролі ў працэсе падрыхтоўкі спектакля і ўвасаблення сцэнічнага вобраза;

– ствараць “біяграфію” ролі і вобраза;

– валодаць голасам і пластыкай у мэтах стварэння сцэнічнага вобраза на аснове аўтарскай характарыстыкі дзеючых асоб;

– распрацоўваць і праводзіць трэнінгі па раскрыцці і развіцці псіхатэхнікі акцёра;

– выкарыстоўваць веды, набытыя ў галіне акцёрскага майстэрства, у выкладчыцкай дзейнасці.

Дзеля дасягнення пастаўленай мэты і вырашэння задач навучання дысцыпліна “Акцёрскае майстэрства” выкладаецца на працягу ўсіх 4,5 гадоў навучання. Агульная колькасць вучэбных гадзін – 610 (з іх 310 – аўдыторныя). Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 10, лабараторныя – 42, практычныя – 200, індывідуальныя – 58 гадзін. У мэтах найлепшага замацавання пройдзенага матэрыялу рэкамендуецца праводзіць псіхафізічны акцёрскі трэнінг, займацца эцюдамі не толькі на першым і другім курсах, але і на працягу ўсіх гадоў навучання.

У мэтах пастаяннага педагагічнага кантролю рэкамендуецца штосеместрава праводзіць *творчыя курсавыя паказы*. З вызначаных тыпавым вучэбным планам формаў кантролю рэкамендуецца праводзіць: 1, 2, 3, 7-ы семестры – экзамены, 5-ы і 8-ы – залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы тэм | Коль-касць аўд. гадзін | У тым ліку | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | практ. | лабарат. | індывід. |
| **Раздзел I. Спецыфіка акцёрскай прафесіі** | **12** | **2** | **10** | | |
| **Тэма 1.** Уводзіны ў курс | 2 | 2 | -- | -- | -- |
| **Тэма 2**. Школа “перажывання” і школа “прадстаўлення” | 4 | -- | 4 | -- | -- |
| **Тэма 3.** Развіццё сістэмы Станіслаўскага | 6 | -- | 6 | -- | -- |
| **Раздзел II. Асноўныя элементы сістэмы Станіслаўскага. Практыкаванні і эцюды** | **86** | **--** | **50** | **6** | **30** |
| **Тэма 4.** Унутраныя элементы сцэнічнага самаадчування акцёра | 43 | -- | 25 | 3 | 15 |
| **Тэма 5.** Знешнія элементы сцэнічнага самаадчування акцёра | 43 | -- | 25 | 3 | 15 |
| **Раздзел III. Спецыфіка стварэння сцэнічнага вобраза ў інсцэніроўках паводле празаічных (паэтычных) твораў** | **56** | **2** | **40** | **10** | **4** |
| **Тэма 6.** Работа акцёра ў працэсе стварэння сцэнічнага вобраза ў інсцэніроўках паводле празаічных (паэтычных) твораў беларускіх (замежных) аўтараў | 56 | 2 | 40 | 10 | 4 |
| **Раздзел IV. Асновы работы над сцэнічным вобразам у аднаактовай драматургіі і тэматычным канцэрце** | **36** | **2** | **20** | **10** | **4** |
| **Тэма 7.** Работа акцёра ў аднаактовых творах беларускай (замежнай) драматургіі | 20 | 2 | 10 | 6 | 2 |
| **Тэма 8.** Асаблівасці работы выканаўцы ў тэматычным канцэрце. Роля вядучага канцэрта | 16 | -- | 10 | 4 | 2 |
| **Раздзел V. Спецыфіка стварэння сцэнічнага вобраза ва ўрыўку з шматактовай драматургіі** | **50** | **2** | **40** | **4** | **4** |
| **Тэма 9.** Асаблівасці работы акцёра ва ўрыўку з шматактовай драматургіі беларускага (замежнага) аўтара | 50 | 2 | 40 | 4 | 4 |
| **Раздзел VI. Спецыфіка стварэння сцэнічнага вобраза ў шматактовай драматургіі** | **70** | **2** | **40** | **12** | **16** |
| **Тэма 10.** Работа акцёра над роляй у працэсе пастаноўкі курсавога спектакля | 70 | 2 | 40 | 12 | 16 |
| **Усяго…** | **310** | **10** | **200** | **42** | **58** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел I. Спецыфіка акцёрскай прафесіі

***Тэма 1. Уводзіны ў курс***

Мэта і задачы курса. Патрабаванні. Літаратура па праблеме выкладання дысцыпліны “Акцёрскае майстэрства”. Тэатр як від мастацтва. Знаёмства з асаблівасцямі акцёрскай прафесіі.

***Тэма 2. Школа “перажывання” і школа “прадстаўлення”***

Асноўныя элементы сістэмы Станіслаўскага. Этыка і дысцыпліна акцёра.

***Тэма 3. Развіццё сістэмы Станіслаўскага***

Пошукі Я.Вахтангава, М.Чэхава, У.Меерхольда, Е.Гратоўскага, П.Брука, А.Васільева і інш.

## Раздзел II. Асноўныя элементы сістэмы Станіслаўскага. Практыкаванні і эцюды

***Тэма 4. Унутраныя элементы[1] сцэнічнага самаадчування акцёра***

Уяўленне, “калі б”, “прапанаваныя абставіны”; “кавалкі” і задачы; увага і яе аб’екты; сцэнічнае дзеянне; адчуванне праўды і вера; унутраны тэмпарытм; эмацыянальная памяць; сцэнічныя зносіны; сцэнічныя прыстасаванні; логіка і паслядоўнасць пачуццяў; унутраная характарнасць; унутраная сцэнічная абаяльнасць; унутраная этыка і дысцыпліна; унутраная вытрымка і завершанасць.

---

[1] Усе пералічаныя элементы існуюць у жыцці ў гарманічным адзінстве, але ў працэсе навучання асновам акцёрскай прафесіі яны вывучаюцца і даследуюцца як паасобку, так і комплексна. Кожны эцюд утрымлівае ў сабе і назіральнасць, і дзеянне, і падзею, і канфлікт, і творчую фантазію. Таму падзел на тэмы – умоўны. Засваенне той ці іншай тэмы студэнтамі не абмяжоўваецца адведзенымі аўдыторнымі гадзінамі, а пераход да новай тэмы не забараняе звяртацца да пройдзенага па праграме. Па меры неабходнасці педагог па акцёрскаму майстэрству мае права вяртацца да не поўнасцю засвоенага студэнтамі матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Практыкаванні і эцюды:*** творчы “зачын”[2]; трэнінг[3]; расслабленне мышцаў; сцэнічная ўвага і жыццёвая назіральнасць; сцэнічнае бачанне; фантазія і творчае ўяўленне; сцэнічнае дзеянне; сцэнічная падзея; дзеянне ў прапанаваных абставінах; творчае апраўданне; памяць простых фізічных дзеянняў; успрыманне і ацэнка факта; сцэнічныя прыстасаванні; знаёмства з элементамі сцэнічнай атмасферы.

### *Тэма 5. Знешнія элементы сцэнічнага самаадчування акцёра*

Расслабленне мышцаў; голас, гук, дыханне; дыкцыя; адчуванне формы фразы і законы мовы; дэкламацыя, адчуванне верша; адчуванне руху, дзеяння, знешняй формы; знешні тэмпарытм; жэстыкуляцыя і пластыка; логіка і паслядоўнасць фізічных дзеянняў; характарнасць (адчуванне сцэнічнага вобраза); знешняя сцэнічная абаяльнасць; знешняя этыка і дысцыпліна; адчуванне дэкарацыі, сцэны; адчуванне групы (адчуванне партнёра).

***Практыкаванні і эцюды:*** творчы “зачын”; трэнінг; расслабленне мышцаў; сцэнічная ўвага і жыццёвая назіральнасць; сцэнічнае бачанне; фантазія і творчае ўяўленне; сцэнічнае дзеянне; сцэнічная падзея; сцэнічнае дзеянне ў прапанаваных абставінах; сцэнічная кампазіцыя; творчае апраўданне; памяць простых фізічных дзеянняў і адчуванняў; успрыманне і ацэнка факта; сцэнічныя прыстасаванні; сцэнічныя зносіны; стварэнне атмасферы; эцюды-асацыяцыі рэчаў; “жывёльны свет”; “цырк”; эцюды на “апраўданае маўчанне”, “моўчкі ўдвух”; эцюды па матывах твораў жывапісу і скульптуры; эцюды па

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

[2] Творчыя “зачыны” – самастойна падрыхтаваны студэнтамі ў пазааўдыторны час творчы паказ на любую тэму: лес, мора, рынак, вакзал, вуліца і г.д. Тэма “зачыну” задаецца педагогам; адзін са студэнтаў выконвае функцыі рэжысёра; курс прымае ўдзел у якасці выканаўцаў. Мэта такіх паказаў перад пачаткам практычных заняткаў па рэжысуры і майстэрству акцёра – абуджэнне творчай прыроды студэнтаў-рэжысёраў, развіццё ўвагі, назіральнасці, уяўлення, фантазіі, вобразнага бачання, засваенне асноў стварэння калектыўнага паказу. Творчыя “зачыны” могуць у далейшым ператварыцца ў цікавыя групавыя эцюды і ўвайсці ў праграму экзаменаў або творчых паказаў курса.

[3] Трэнінг – комплекс заданняў, мэтанакіраваны на раскрыццё і развіццё акцёрскіх здольнасцей студэнтаў-рэжысёраў. Распрацоўваецца педагогам па акцёрскаму майстэрству ў залежнасці ад фізічных і творчых даных студэнтаў і пастаўленай педагагічнай мэты. Асновай для стварэння трэнінгавых заданняў служаць працы: *Гиппиус, С.В.* Гимнастика чувств: тренинг творческой психотехники / С.В.Гиппиус. – М.: Искусство, 1967 (альбо перавыданне); *Грачёва, Л.В.* Актерский тренинг: теория и практика / Л.В.Грачёва. – СПб.: Речь, 2003; Мастерство актера: учеб. программа по специальности 1-17 01 01 “Актерское искусство” / сост. Л.А.Монакова. – Мн.: БГАИ, 2006; *Воронецкий, Ф.С.* Основы мастерства актера: учеб. пособ. / Ф.С.Воронецкий. – Мн.: БГАИ, 2003; *Мішчанчук, У.А.* Псіхафізічны трэнінг: вуч.-метад. дапам. для спецыяльнасці Г 11.01 00 “Акцёрскае мастацтва” (завочная форма навучання) / У.А.Мішчанчук. – Мн.: БДАМ, 1999; *Новицкая, Л.П.* Тренинг и муштра: изучение элементов психотехники актерского мастерства: для режиссеров-педагогов культ.-просвет. училищ и нар. театров / Л.П.Новицкая. – М.: Сов. Россия, 1969.

матывах літаратурных твораў; эцюды "на паўзу"; эцюды па матывах музычных твораў; эцюды-імправізацыі на прапанаваную выкладчыкам тэму (напрыклад, "на тры словы" і інш.).

## Раздзел III. Спецыфіка стварэння сцэнічнага вобраза ў інсцэніроўках паводле празаічных (паэтычных) твораў

***Тэма 6. Работа акцёра ў працэсе стварэння сцэнічнага вобраза ў інсцэніроўках паводле празаічных (паэтычных) твораў беларускіх (замежных) аўтараў***

"Зачын". Трэнінг. Прынцып выбару твора для інсцэніравання. Знаёмства з асноўнымі падзеямі з жыцця аўтара і асаблівасцямі яго творчасці, жанравай і стылістычнай накіраванасцю. Разбор твора і роляў. Стварэнне інсцэніроўкі. Вызначэнне асноўных і другарадных тэм і ідэй у творы і інсцэніроўцы, жанравых і стылявых асаблівасцей. Звышзадача твора і ролі. Прапанаваныя абставіны ў творы і інсцэніроўцы. Прапанаваныя абставіны ролі. Канфлікт у творы і інсцэніроўцы. Носьбіты скразнога і контрскразнога дзеяння ў творы і інсцэніроўцы. Кампазіцыя твора і інсцэніроўкі. Падзейны рад твора і інсцэніроўкі. Прынцыпы мізансцэнавання будучага спектакля. Характарыстыка дзеючых асоб твора і інсцэніроўкі. Стварэнне "біяграфіі" ролі. Работа над унутранай і знешняй характарнасцю сцэнічнага вобраза. Стварэнне рэпетыцыйнай атмасферы. Прагоны. Рэжым спектакля. Творчы паказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Асновы работы над сцэнічным вобразам у аднаактовай драматургіі і тэматычным канцэрце

***Тэма 7. Работа акцёра ў аднаактовых творах беларускай (замежнай) драматургіі***

"Зачын". Трэнінг. Выбар п'есы. Размеркаванне роляў. Чытка па ролях. Аналіз творчасці аўтара. Разбор п'есы і роляў. Вызначэнне тэмы, ідэі, жанру (стылю) п'есы. Прапанаваныя абставіны п'есы і ролі. Вызначэнне звышзадачы ролі. Асноўны і другарадныя канфлікты, іх носьбіты. Кампазіцыя. Падзейны рад. Прынцып мізансцэнавання будучага спектакля. Характарыстыка дзеючых асоб – аўтарская і рэжысёрская. Пошукі

характарнасці ў рабоце над роляй: мова, жэсты, звычкі, паходка, тэмперамент, "цэнтр цяжару" і інш. Работа ў выгарадках і на сцэнічнай пляцоўцы. Падбор музычна-шумавога і сцэнаграфічнага вырашэння. Работа з рэквізітам. Прынцыпы ўзаемадзеяння з гледачом. Сцэнічная атмасфера.

***Тэма 8. Асаблівасці работы выканаўцы ў тэматычным канцэрце. Роля вядучага канцэрта***

Стварэнне сцэнарыя тэматычнага канцэрта. Размеркаванне роляў. Падрыхтоўка канцэртных нумароў. Стварэнне дэкарацыйнага і музычнага афармлення канцэрта. Асаблівасці рэпетыцыйнага працэсу. Прагоны канцэрта. Творчы паказ.

## Раздзел V. Спецыфіка стварэння сцэнічнага вобраза ва ўрыўку з шматактовай драматургіі

***Тэма 9. Асаблівасці работы акцёра ва ўрыўку з шматактовай драматургіі беларускага (замежнага) аўтара***

"Зачын". Трэнінг. Прынцыпы і падыходы да выбару матэрыялу. Падбор п'ес для аналізу і пастаноўкі. Вывучэнне творчасці аўтара, асаблівасцей яго стылю. Разбор п'есы і роляў. Выбар урыўка для пастаноўкі. Роля абранага ўрыўка ў кампазіцыйнай будове п'есы. Размеркаванне роляў. Чытка па ролях. Вызначэнне тэмы, ідэі, жанру і стылю твора, урыўка і пастаноўкі. Прапанаваныя абставіны п'есы і ўрыўка. Кампазіцыйная будова п'есы і ўрыўка. Падзейны рад п'есы і ўрыўка. Канфлікты ў п'есе і ўрыўку. Тэмпарытм развіцця дзеяння ў п'есе і ўрыўку. Характарыстыка дзеючых асоб, занятых ва ўрыўку. Прынцыпы мізансцэнавання будучага спектакля. Пошукі характарнасці ў працэсе стварэння сцэнічнага вобраза. "Біяграфія" вобраза. Музычна-шумавое і сцэнаграфічнае вырашэнне ўрыўка. Сцэнічная атмасфера. Рэпетыцыйны працэс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VI. Спецыфіка стварэння сцэнічнага вобраза ў шматактовай драматургіі

### *Тэма 10. Работа акцёра над роляй у працэсе пастаноўкі курсавога спектакля*

"Зачын". Трэнінг. Пошук п'есы для курсавога спектакля, прынцыпы адбору матэрыялу. Вывучэнне творчасці аўтара, яе асаблівасцей. Аналіз твора і роляў. Вызначэнне ідэйна-тэматычнага зместу, стылю і жанру. Звышзадача п'есы, ролі і спектакля. Прапанаваныя абставіны п'есы, ролі і спектакля. Кампазіцыя п'есы і спектакля. Канфлікты. Расстаноўка сіл у п'есе і спектаклі. Носьбіты скразнога і контрскразнога дзеяння. Характарыстыка дзеючых асоб. "Біяграфія" ролі. Работа над характарнасцю. Рэпетыцыя спектакля па актах. Сцэнаграфічнае і музычна-шумавое вырашэнне спектакля. Светлавое вырашэнне. Прынцыпы мізансцэнавання. Рэпетыцыі-прагоны курсавога спектакля. Рэжым спектакля. Паказ. Работа над спектаклем пасля прэм'еры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *Воронецкий, Ф.С.* Основы мастерства актера: учеб. пособие / Ф.С.Воронецкий. – Мн.: БГАИ, 2003. – 119 с.

2. *Гиппиус, С.В.* Гимнастика чувств: тренинг творческой психотехники / С.В.Гиппиус. – М.: Искусство, 1967. – 295 с. (или переиздание).

3. *Грачёва, Л.В.* Актерский тренинг: теория и практика / Л.В.Грачёва. – СПб.: Речь, 2003. – 163 с.

4. *Захава, Б.Е.* Мастерство актера и режиссера: учеб. пособие для спец. учеб. заведений культуры и искусства / Б.Е.Захава. – 4-е изд., испр. и доп. – М.: Просвещение, 1978. – 334 с.

5. *Мастерство* актера: учеб. программа по специальности 1 17 01 01 “Актерское искусство” / сост. Л.А.Монакова. – Мн.: БГАИ, 2006. – 26 с.

6. *Мішчанчук, У.А.* Псіхафізічны трэнінг: вучэб.-метад. дапаможнік для спецыяльнасці Г 11 01 01 “Акцёрскае мастацтва” (завочная форма навучання) / У.А.Мішчанчук. – Мн.: БДАМ, 1999. – 17 с.

7. *Новицкая, Л.П.* Тренинг и муштра. Изучение элементов психотехники актерского мастерства / для режиссеров-педагогов культ.-просвет. училищ и народных театров / Л.П.Новицкая. – М.: Сов. Россия, 1969. – 272 с.

8. *Станиславский, К.С.* Собр. соч.: в 9 т. / предисл. О.Н.Ефремова, подготовка текста, статьи, вступление И.Н.Соловьёвой; отв. ред. О.Н.Ефремов; МХАТ СССР им. М.Горького, науч.-иссл. сектор школы-студии им. В.И.Немировича-Данченко. – М.: Искусство, 1988. – Т.1. Моя жизнь в искусстве / под ред. И.Н.Соловьёвой. – 622 с.; Т. 2. Работа актера над собой, ч.1: Работа над собой в творческом процессе переживания: дневник ученика / ред. и автор вступления А.М.Смелянский, подготовка текста, комм. Г.В.Кристи, В.В.Дыбовского. – 508 с.; Т. 3. Работа актера над собой, ч.2: Работа над собой в творческом процессе воплощения: матер. к книгам / вступ. ст. Б.А.Покровского, комм. В.В.Дыбовского, Г.В.Кристи. – 505 с.; Работа актера над ролью: матер. к книгам / сост., вступ. ст., подг. текста, комм. И.Н.Виноградской. – 398 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Тэатральная* Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / пад агул. рэд. А.В.Сабалеўскага. – Мн.: Бел.ЭН, 2002–2003.

*Дадатковая*

1. *Азы* актерского мастерства: сб. ст. к 40-летию театрально-педагог. деятельности В.В.Петрова. – СПб.: Речь, 2002. – 239 с.

2. *Актер* в современном театре: сб. науч. тр. – Л.: ЛГИТМиК, 1989.

3. *Атрошчанка, А.* Фларыян Ждановіч: біяграф. нарыс / А.Атрошчанка. – Мн.: Маст. літ., 1972. – 120 с.: іл.

4. *Атрошчанка, А.* Уладзіслаў Галубок / А.Атрошчанка. – Мн., 1969.

5. *Боровик, Г.И.* Пьеса, замысел, спектакль: метод. реком. по курсу “Режиссура и мастерство актера” для студентов III и IУ курсов очного и заочного обучения по специализации “Режиссура любительского театра” при написании курсовой работы “Постановочный план спектакля” и постановке дипломной работы / Г.И.Боровик. – Мн.: 1991. – 30 с.

6. *Гаробчанка, Т.Я.* Тэатр на мяжы стагоддзяў: сучасны беларускі драматычны тэатр / Т.Я. Гаробчанка. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 367 с.

7. *Голубовский, Б.Г.* Между репетициями. Самостоятельная работа артиста / Б.Г.Голубовский. – М.: Сов. Россия, 1988. – 128 с. (Б-ка “В помощь худ. самодеят.” – № 7. Труд актера. – Вып. 35).

8. *Горчаков, Н.М.* О работе режиссера с актером / Н.М.Горчаков. – М., 1973.

9. *Гринер, В.А.* Ритм в искусстве актера: метод. пособие для театр. и культпросвет. училищ / В.А.Гринер. – М.: Просвещение, 1966. – 171 с.

10. *Ершов, Л.* Технология актерского искусства / Л.Ершов. – М.: Искусство, 1959.

11. *Импровизация* и метод действенного анализа. – М.: Сов. Россия, 1986. – 80 с. (Б-ка “В помощь худож. самодеят.” – № 21. Труд актера; вып. 33).

12. *Каляда, А.А.* Слоўнік акцёра і рэжысёра / А.А.Каляда. – Мн., 1995.

13. *Корогородский, З.Я.* Режиссер и актер / З.Я.Корогородский. – М.: Сов. Россия, 1972. (Б-ка “В помощь худож. самодеят.”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Кнебель, М.О.* О действенном анализе пьесы и роли: учеб. пособие для театральных вузов / М.О.Кнебель. – М.: Искусство, 1982. – 118 с.

*15. Кристи, Г.* Воспитание актера школы Станиславского / Г.Кристи. – М.: Искусство, 1968.

*16. Крыжицкий, К.Г.* О системе Станиславского / К.Г.Крыжицкий. – М.: ГИКПЛ, 1955. – 88 с.

*17. Мейерхольд, В.Э.* Лекции (1918–1919) / В.Э.Мейерхольд; сост. О.М.Фельдман. – М.: О.Г.И, 2000. – 280 с.

*18. Немирович-Данченко, В.И.* Театральное наследие: в 2 т. / В.И.Немирович-Данченко. – М.: Искусство, 1952–1954. – Т.1. Статьи. Речи. Беседы. Письма / ред.-сост. В.Я. Виленкин. – 1952. – 442 с.: ил.

*19. Няфёд, У.І.* Ігнат Буйніцкі – бацька беларускага тэатра / У.І.Няфёд. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 123 с.

*20. Плотников, Н.* Актер и его работа / Н.Плотников. – М.: Искусство, 1982.

*21. Пятровіч, С.А.* Еўсцігней Міровіч / С.А.Пятровіч. – Мн.: Маст. літ., 1987. – 168 с.

*22. Симонов, П.В.* Метод Станиславского и физиология эмоций / П.В.Симонов. – М.: АН СССР, 1962.

*23. Симонов, П.В.* Что такое эмоция? / П.В.Симонов. – М., 1966.

*24. Станиславский, К.С.* Этика // Работа актера над собой / К.С.Станиславский; вступ. ст. А.Д.Попова. – М.: Искусство, 1981. – Ч.2.

*25. Станиславский* репетирует: записи и стенограммы репетиций. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Моск. худож. театр, 2000. – 520 с.

*26. Стромов, Ю.А.* Путь актера к творческому перевоплощению: пособие для театр. и культ.-просвет. учеб. заведений и коллективов худож. самодеятельности / Ю.А.Стромов. – М.: Просвещение, 1975. – 80 с., ил.

*27. Табаков, О.П.* Моя настоящая жизнь / О.П.Табаков. – М., 1999.

*28. Топорков, В.* О технике актера / В.Топорков. – М.: Искусство, 1954.

*29. Товстоногов, Г.А.* Зеркало сцены: в 2 ч. / Г.А.Товстоногов. – Л., 1980. – Ч.1, 2.

*30. Фромм, Э.* Душа человека / Э.Фромм. – М., 1992.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*31. Фрейд, З.* Психология бессознательного / З.Фрейд. – М., 1990.

*32. Хрэстаматыя* па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 2 т. / уклад., рэд. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А.В.Сабалеўскага. – Мн., 1975.

*32. Шихматов, Л.М.* Сценические этюды. Подход к роли. – 2-е изд., испр. и доп. / Л.М.Шихматов. – М.: Просвещение, 1966. – 247 с.

*33. Черкасов, Н.* Записки советского актера / Н.Черкасов. – М.: Искусство, 1953.

*34. Чехов, М.* Воспоминания. Письма / М.Чехов. – М.: Локид-пресс, 2001. – 668 с.; ил. (“Голоса. Век XX”).

*35. Юнг, К.Г.* Психологические типы / К.Г.Юнг. – М., 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**АКЦЁРСКАЕ МАЙСТЭРСТВА**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*
*напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-03 Народная творчасць*
*(тэатральная))*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэдактар В.В.Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2009 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,52.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# АКЦЁРСКАЕ МАЙСТЭРСТВА

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*
*(напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-03 Народная творчасць*
*(тэатральная))*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2010